Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЖНІЎНЯ 2016 г. СУБОТА № 155 (28265)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Кандыдатаў у жніўні лічаць

СТАР. 2



## Газета і кава. Гэта модна!

СТАР. 4



## Сведка вялікай эпохі

СТАР. 10

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$4,7 млрд**

*уклалі ў рэальны сектар эканомікі Беларусі замежныя інвестары за студзень-чэрвень 2016 года (акрамя банкаў). Асноўнымі інвестарамі арганізацый краіны былі суб'екты гаспадарання Расіі (50,2% інвестыцый), Вялікабрытаніі (20,5%) і Кіпра (7,5%). Паступленне прамых замежных інвестыцый склала $3,9 млрд. У першым паўгоддзі арганізацыі Беларусі (акрамя банкаў) накіравалі за мяжу інвестыцый на суму 2 млрд долараў. Значныя аб'ёмы інвестыцый прызначаліся суб'ектам гаспадарання Расіі (51,8% ад усіх накіраваных інвестыцый), Украіны (21,9%), Вялікабрытаніі (14,6%).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.08.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9555 ▼ |
| Еўра | 2,1797 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0302 ■ |
| Укр. грыўня | 0,0779 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Пра Святое...

Жнівеньскі дзень дагараў. На фоне амаль бясколерных нябёсаў сонца нагадвала цукерку-карамельку. Стрэлка на старым дарожным знаку паказвала на поўдзень. Сярод тысячы ўказальнікаў і знакаў на нашых дарогах мне ўпершыню патрапіўся гэты сакральны надпіс — Святое. Такое таямнічае, загадкавае слова! Яно клікала ў падарожжа, абяцала нечаканую сустрэчу, інтрыгавала: няўжо і сапраўды ў нас ёсць такая вёска?!

Знакавых мясцін, якія па праву называюць святымі, у нас нямала: цэрквы, касцёлы, кляштары, прошчы і могілкі, крыніцы, дрэвы, камяні... Ні сёння, ні ўчора — стагоддзямі намоленыя, яны грэюць нашы душы, даюць моц і надзею. У беларускай тапаніміцы ёсць некалькі прыкладаў, калі населеныя пункты называюцца Святымі. Чаму раней давалі такія назвы? Чым адметны і непаўторны кожны такі куточак? Упэўнены, людзі заўсёды будуць шукаць адказы на гэтыя пытанні...

СТАР. 12






Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Самая маладая сям'я ў вёсцы Святое — Віталь і Ірына ЗАХАРОШКІ і іх дачушка Аляксандра.

■ Рэпарцёр атрымаў заданне

# НЕ ПАЕЎ, АДКУЛЬ СІЛА БУДЗЕ?

## Як карэспандэнт «Звязды» карміла абедам хлебаробаў агракамбіната «Зара»

Сёння ў вёсцы самая гарачая пара. Ураджай добры, трэба толькі хутка і якасна яго ўбраць. Хлебаробы выкарыстоўваюць кожную сонечную хвіліну, часу няма нават на паездкі ў сталовую. Таму гарачыя абеды для іх прывозяць проста ў поле. Карэспандэнт «Звязды» атрымала заданне хутка і якасна накарміць тых, ад каго залежыць харчовая бяспека нашай краіны. Магчымасць яго выканаць прадставіла адна з лепшых гаспадарак Магілёўскай вобласці — агракамбінат «Зара».

СТАР. 3



Уладзімір Корсак: «Люблю панцак з падліўкай».

# А Я НА ФУРЫ ЕЗДЖУ!

## Дальнабой вачыма бландзінкі



Траса. Фура. Дзяўчына. У Гродне жыве адзіная ў Беларусі бландзінка-дальнабойшчыца. Вераніка Рылоўцава ўтаймоўвае магістральны цягач не першы год, і тэхнічныя характарыстыкі машыны захапляюць яе не менш чым паказы мод. Стыльна апранутая дзяўчына развеяла стэрэатып пра дальнабойшчыка ў трэніках. Вераніка прабіла апошні бастыён сапраўднай мужчынскай прафесіі. Больш за тое — у свае 24 гады яна пабудавала на гэтым удалы бізнес. І здзіўленню няма межаў, калі дзяўчына расказвае пра свой унікальны шлях у дальнабой.

СТАР. 7